# Дырэктару БДТ-3 Галубку,

## усім творчым работнікам і ўсяму калектыву тэатру

Віншую вас, таварышы, з пятнаццацігадовым юбілеем. Ваш тэатр рос і развіваўся як крыніца совецкага мастацтва разам з усім вызваленым беларускім народам. Ленінскі лозунг—«мастацтва масам» з'явіўся кіруючым пачаткам у рабоце вашага тэатра з першых дзён яго існавання. Імення ў гэтым залог вашага выдатнага палітычнага і мастацкага росту і той вялікай папулярнасці і любві, якой вы заслужана карыстаецеся сярод калгаснікаў, рабочых і ўсіх працоўных.

Ваш тэатр заўсёды чэрпаў свае сілы і веды ў разняволеным, падымаючымся працоўным народзе. Мне добра вядомы вашы паходы ў цяжкіх умовах у самыя захалусныя куткі нашай Беларусі, калі вы ў палескіх вёсках паказвалі дасягненні мастацтва, падымалі масы сялянства на барацьбу за новае жыццё, за калгасы. З радасцю ўспамінаю, як я сустракаў вас неаднаразова на працягу раду гадоў у самых аддаленых вёсках БССР вандруючымі прапаведнікамі совецкага мастацтва, якія пагарджаюць усякімі няўдобствамі, цяжкасцямі і нават нястачамі. Асабліва заслугоўвае быць адзначаным арганізатар таварыш Галубок, які па праву, заслужана носіць званне народнага артыста Беларускай рэспублікі.

З задавальненнем адзначаю ідэйны і мастацкі рост вашага калектыва. Ад вандроўнага тэатра вы выраслі ў буйную мастацкую сілу. Гэты рост праходзіў па шляху ломкі буржуазна-нацыяналістычнай ідэалогіі ў нацыянальным мастацтве і рашучага ўкаранення ідэй пролетарскага інтэрнацыяналізма, тым самым вы ўключыліся ў агульныя рады барацьбы за ўрачыстасць ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Палкае прывітанне вам, таварышы! Мацуйце і далей пролетарскае мастацтва, рухайце яго наперад! Узнімайце вышэй і вышэй сцяг нашай партыі—сцяг Леніна—Сталіна!

**Старшыня Соўнаркома БССР**
**Н. ГАЛАДЗЕД.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ